**Тлумачальная запіска да вучэбна-метадычнага комплекса**

**“Гісторыя музейнай справы”**

Вучэбна-метадычны комплекс “Гісторыя музейнай справы” распрацаваны для спецыяльнасці 1-23 01 12 “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” (дзённая форма навучання).

Мэтай курса з’яўляецца фармаванне глыбокіх ведаў пра сутнасць музейнай справы, праблемах яе гістарычнай эвалюцыі, асноўных этапах яе развіцця, дзейнасці яе найбольш выдатных прадстаўнікоў. У падмурак курса пакладзена фармаванне фундамента музеялагічных ведаў шляхам вывучэння лепшых дасягненняў сусветнай і айчыннай музейнай практыцы ў яе гістарычнай перспектыве.

Вучэбна-метадычны комплекс складаецца з наступных раздзелаў:

- Тэарэтычнага, куды ўваходзяць матэрыялы для тэарэтычнага вывучэння курса “Гісторыя музейнай справы” – канспект лекцый па асобных тэмах курсу.

- Практычны раздзел уключае матэрыялы па правядзенні семінарскіх заняткаў, пытанні да семінараў, метадычныя ўказанні па вывучэнні дычцыпліны.

- Раздзел контролю ведаў уключае спіс пытанняў да экзамена, тэмы рэфератаў, тэсты для самапроверкі.

- Дапаможны раздзел уключае тыпавую вучэбную праграму, гласарый, спіс рэкамендаванай літаратуры.